зорных передачах, содержащих хронику дня, недели, месяца. Переданная в редакцию корреспонденция содержит более полное и более убедительное освещение события.

Радиокорреспонденцию озвучивает, как правило, сам автор. Именно авторское изложение придает фактам, о которых идет речь, личностную окраску, усиливая эмоциональное воздействие на аудиторию. Слушатели понимают, что о событии им рассказывает непосредственный очевидец, и это увеличивает их доверие к материалу.

Близка по форме к корреспонденции так называемая «комментированная новость» – небольшой по размеру информационный материал, в котором не только сообщается факт, характеризующий сущность события, но и содержится его оценка. Комментированная новость состоит из двух составных элементов: информационного сообщения о факте и мнения о нем автора сообщения – обозревателя, комментатора. Вторая, комментирующая, часть вводится в текст различными способами, например с помощью слов «Наш корреспондент сообщает, что...». Эта разновидность корреспонденции также чрезвычайно ценна для информационной службы, т. к. позволяет сразу же за сообщением о факте разъяснить его значение, что помогает слушателю понять сущность факта, уяснить себе его место в цепи других фактов и событий. В этом сходство корреспонденции с комментарием.

**Алена Смірнова**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ ЖАНРАЎ РАДЫЁЖУРНАЛІСТЫКІ НА МЯЖЫ XX–XXI стст.

У гісторыю радыёжурналістыкі перыяд мяжы стагоддзяў увайшоў як час пераасэнсавання рэчаіснасці, фарміравання новага мыслення ў дачыненні не толькі да гістарычнага шляху краіны, але і да лакальных працэсаў, а дакладней, развіцця радыёвяшчання, яго ролі ў жыцці грамадства. Драматычныя падзеі путчу 1991 г., развал СССР, спроба перавароту 1993 г., расстрэл Белага дома – вынікі гэтых падзей сталі буйнымі вехамі, якія акрэслілі шлях развіцця постсавецкіх краін, іх найноўшую гісторыю і будучыню.

Гэтыя складаныя працэсы патрабавалі глыбокага асэнсавання, аналізу ў сродках масавай інфармацыі. Дыскусіі на старонках газет, на тэлеэкране, у радыёэфіры былі бескампраміснымі. Дэмакратызацыя ўсіх бакоў жыцця, якая ішла праз СМІ, была неадназначнай. Нашэс-

це масавай культуры ў яе нізкапробным варыянце, амерыканізацыя цэнтральных каналаў тэлебачання сталі дэструктыўна ўплываць на аўдыторыю. Тэлебачанне ўвогуле стала адыгрываць больш значную ролю ў жыцці грамадства, чым гэта было ў папярэднія дзесяцігоддзі.

Перабудова радыёвяшчання 1990-х гг. была звязана ў першую чаргу з рэарганізацыяй базісных ідэалагічных установак. Сярод найбольш важных прыкмет і тэндэнцый радыёвяшчання гэтага перыяду можна вылучыць наступныя: дэманапалізацыя вяшчання, з'ўленне камерцыйных радыёстанцый; павелічэнне аб'ёму інфармацыйнага вяшчання, прамога эфіру, аўтарскіх праграм; памяншэнне праграм часопіснага тыпу, маналагічных жанраў, аб'ёму дакументальна-мастацкага вяшчання; пашырэнне розных форм інтэрактыўнага вяшчання; узмацненне ролі вядучага як кампазіцыйнага цэнтра праграмы; змяненне танальнасці зносін з аўдыторяй і самой аўдыторыі, яе дыферынцыяцыя па каштоўнасных арыенцірах, чаканнях, перавагах; з'яўленне вяшчання ў інтэрнэце; мадыфікацыя жанраў, абумоўленая комплексам прычын, у першую чаргу змяненнем функцый вяшчання; рост значэння мясцовага вяшчання [1, с. 89].

Змяненне ўмоў працы, відазмяненне набору функцый, новыя адносіны з аўдыторыяй актыўна паўплывалі на прынцыпы праграмавання вяшчальнай сеткі. Яе аснову на радыёстанцыях універсальнага тыпу, якія ўключаюць у сябе ўвесь спектр вяшчання, склалі праграмы навін, інфармацыйна-аналітычныя праграмы. Падчас перабудовы вяшчання паскорыўся рытм і дынаміка гучання навін. Найбольш шчыльнай стала інфармацыйнасць тэкстаў за кошт скарачэння іх у аб'ёме. Павялічыўся аб'ём рэкламных праграм.

Адна з асноўных тэндэнцый радыёвяшчання перабудовы (характэрна і для сучаснага вяшчання) – адмаўленне ў значнай ступені ад пісьмовых тэкстаў. Прамы эфір наблізіў вяшчанне да звычайных маўленчых зносін. Новыя задачы вяшчання 1990-х гг. і новыя ўмовы, у якіх яно стала працаваць, запатрабавалі ў эфіры жывое непадрыхтаванае маўленне. Значна скараціліся тэкставыя фрагменты ва ўсіх відах перадач, аб'ём маналагічных размоў, лекцый, выступленняў ля мікрафона. Функцыянальныя змены ў радыёжурналістыцы паўплывалі на кожную групу жанраў. Найбольшую трансфармцыю перажылі мастацка-публіцыстычныя жанры, яны сталі радзей гучаць у эфіры. Практычна зніклі радыёзамалёўкі, радыёнарысы, радыёапавяданні. Адукацыйная, выхаваўчая, эстэтычная функцыі, характэрныя для жанраў гэтай групы, адышлі на другі план. Памяншэнне колькасці гэтых жанраў звязана

таксама і з тым, што яны гучалі раней у праграмах часопіснага тыпу, якія сталі выходзіць у эфір значна радзей, у сувязі з адмаўленнем ад галіновага вяшчання [2, с. 85].

Скараціліся хранаметражы аўтарскіх матэрыялаў. Так, калі раней нарыс мог гучаць у эфіры да паўгадзіны, то сёння ў лепшым выпадку да дзесяці хвілін, калі ўвогуле ён існуе. Многія практыкі пачалі «вымяраць» жанры не глыбінёй думкі, не ступенню раскрыцця тэмы, а хранаметражом: 1,5 хвіліны – інфармацыйнае паведамленне; 1,5-2 хвіліны – каменціраванае інфармацыйнае паведамленне; 3-4 хвіліны – рэпартаж; 5 хвілін – гэта ўжо, напэўна, нарыс.

Айчынны радыёрынак пачаў дзяліцца на пэўныя тэматычныя сегменты: так, на Першым канале Беларускага радыё прыярытэтным засталося грамадска-палітычнае вяшчанне, з’явілася шмат дыялагічных праграм у прамым эфіры, якія задавальнялі патрэбу слухачоў у інтэрактыўнасці; у студзені 2002 г. узнікла аб’ектыўная патрэба ў з’яўленні новай радыёстанцыі – «Культура», у аснове канцэпцыі якой – папулярызацыя найлепшых дасягненняў сусветнай і нацыянальнай культуры; на радыёстанцыях ФМ-дыяпазону асноўным відам вяшчання было абрана музычнае. З аднаго боку, такая дыферынцыяцыя спрыяе больш глыбокаму і асэнсаванаму выкарыстанню тых рэсурсаў, якімі валодае станцыя, мэтанакіраванаму звароту да рэальнай аўдыторыі, а з другога – садзейнічае размежаванню той самай аўдыторыі, якая па-снабісцку ацэньвае радыёгусты канкурэнтаў.

Такім чынам, змены, якія адбыліся ў жанравай сістэме радыёжурналістыкі, былі абумоўлены як агульнымі працэсамі вяшчання, так і кардынальнымі пераменамі ў палітычным, эканамічным, сацыяльным жыцці грамадства. Менавіта ў перыяд памежжа стагоддзяў стала відавочным, што радыё як сродак масавай інфармацыі губляе не тое, каб папулярнасць, але яно вымушана падпарадкоўвацца новым правілам, якія дыктуе час, і ў гэтых правілах асноўная стаўка робіцца не на доўгія маналагічныя выступленні, а на дынамічнае інфармацыйнае вяшчанне, на дыялагічнасць і інтэрактыў.

*Літаратура*

1. Смирнов, В. В. Жанровая система радиожурналистики. История. Теория. Особенности функционирования / В. В. Смирнов. – Ростов н/Д, 2006.
2. Тхагушев, И. Н. Современное радиовещание. Направление исследований / И. Н. Тхагушев // Журналистика в 2005 году. – Ч. 2. – М, 2006.